аб пяці чыноўніках, якіх прызначыў Лукашэнка

Аляксандр Лукашэнка зладзіў 28 сакавіка кадравы дзень. Пра некаторых з прызначэнцаў у артыкуле «Нашай Нівы».

Пазітыўны пасол у ААЭ



Андрэй Лучанок у нідэрландскіх цюльпанах. Фота з ok.ru

Ад лета ў Беларусі не было свайго пасла ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. Справа ў тым, што мінулы дыпламат Раман Галоўчанка пайшоў на павышэнне і ўзначаліў Вайскова-прамысловы камітэт. ААЭ — гэта ключавая для Беларусі краіна ў арабскім свеце. Туды на адпачынак не раз ездзіў Аляксандр Лукашэнка, нярэдка з прыватнымі і дзяржаўнымі візітамі ў Абу-Дабі наведваецца і старэйшы сын кіраўніка Беларусі Віктар.

Новаму паслу Андрэю Лучанку 46 гадоў. Ён мінчук, хадзіў у школу №127 на вуліцы Берута. Пасля гэтага вучыўся ў Лінгвістычным універсітэце на факультэце французскай мовы, які скончыў у 1994 годзе. Пасля гэтага трапіў на службу ў МЗС.

Праца ў ААЭ будзе першай самастойна ў кар'еры Лучанка. Напрыканцы 1990-х ён з'яўляўся супрацоўнікам пасольства нашай краіны ў Сірыі. У сацыяльных сетках ён згадваў, што сумуе у Беларусі па ўсходняй кухні, а вось палітычную кухню гэтай краіны называе «прэснай».



Быков: «Российский монстр впал в вечную ошибку всех тоталитарных систем» Прогноз на осень от писателя.



«Рост ВВП замедляется, и речь идет о потенциально упущенных возможностях» ЕС выдал беларусам сотни тысяч разрешений на проживание. Как это отразится на беларусской экономике?



«Цяпер беларусы пад такім прарасейскім ціскам, пад якім ня былі з моманту здушэньня паўстаньня 1863 году» Навумчык: Беларусь уступіла ў самы чорны пэрыяд сваёй гісторыі.

Пасля спадар Лучанок з’яўляўся дарадцам пасла нашай краіны ў Нідэрландах. Відавочна, што жыццём у гэтай краіне ён пранікнуўся. Шмат выкладаў здымках і з цюльпанамі, і з сырамі. Лучанок заўзяты падарожнік, у яго ёсць фоткі, як з Кітая, гэтак і з Манблана.

Апошнім часам дыпламат працаваў у Мінску, дзе быў начальнікам упраўлення Афрыкі і Блізкага Усходу. Па гэтай лініі нярэдка сустракаўся з паслом ААЭ ў Беларусі.

Спадар Лучанок — футбольны аматар, заўзее за марсельскі «Алімпік». Сярод упадабаных ім старонак у фэйсбуку: «Лявон Вольскі», «Мова на кожны дзень», «Уладзімір Караткевіч», «Падарожжы дылетанта».

Прыхільнік Пуціна ўзначаліў Фрунзенскі раён



Сяргей Шкруднеў. Фота з ok.ru

Самы шматлікі раён Мінска і ўсё Беларусі — Фрунзенскі — узначаліў 43-гадовы Сяргей Шкруднеў. Да апошняга часу ён быў начальнікам рэгіянальнага развіцця Апарата Савета міністраў.

Шкруднеў нарадзіўся ў вёсцы Іванаўка Амурскай вобласці Расіі. Праўда, гадаваўся ён у вёсцы Кузьмічы Любанскага раёна. Там жа скончыў школу. Пасля паступіў на факультэт механізацыі БДАТУ. Пасля вучобы адслужыў у чыгуначных войсках у Жодзіне.

Працаваў у Мінскім аблспажыўсаюзе, у Дэпартаменце дзяржаўнай інспекцыі працы, адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Мінска.

Шкруднеў мае двух сыноў. Адзін з іх, прынамсі, быў навучэнцам Мінскага суворaўскага вучылішча.



Невзоров: Путинский веночек на похоронах Пригожина будет самым лаконичным «На церемонии будет не хватать счастливого Шойгу».



В российском Совбезе напряглись из-за Кастуся Калиновского И обвинили беларусского национального героя в «бандитизме».

ЕЩЕ КАРТИНА ДНЯ

ПОПУЛЯРНЫЕ МНЕНИЯ



Юрый Дракахруст

Не выключана, што Мінск усё ж рэагуе мы чулі заявы Лукашэнкі пасля гібелі І жыць». Магчыма, ён і будзе «жыць» як

ЕЩЕ МНЕНИЯ

LIFE



Адметна на якія суполкі Сяргей Шкруднеў падпісаны ў сацыяльных сетках: «Клуб сяброў У.У.Пуціна», «Настальгія па СССР», «Уладзімір Уладзіміравіч Пуцін». Шмат чыноўнік і лайкае выяваў з Пуціным. Калі паглядзець яго старонку, то там і віншаванне Лаўрова з днём нараджэння, і рэакцыя на забарону расійскім лёгкаатлетам браць удзел у Алімпіядзе, і пра расійскую «пятую калону», і пра тое, што ЗША адцяпалі ў Мексікі Тэхас. Складваецца ўражанне, што Шкруднеў жыве зусім не ў Беларусі, а ў суседняй дзяржаве.

Сябра экзатычнай партыі



Фота з ctv.by

37-гадовы Андрэй Любатынскі стаў кіраўніком Кастрычніцкага раёна Мінска. Ён родам з Ваўкавыска, хадзіў там у 6-ю школу.



Обложка дня: «Украина, держись!»



Неполитические жабы: «Это вы правильно зашли»



Фотожабы: «Холостяк в Крыму»



Чарнуха: «Варта будаваць свой кантэкст, менш жыць у расійскіх наратывах»

ЕЩЕ

Вучыўся ў наргасе, які скончыў у 2004 годзе. Адметна, што працоўную кар’еру пачаў у БРСМ. Ад 2004 да 2007 быў сакратаром пярвічкі БРСМ у родным універсітэце. Пасля гэтага звязаў лёс з Заводскім раёнам Мінска, дзе пачынаў начальнікам па справах моладзі, а апошняй ягонай пасадай было — начальнік Упраўлення капітальнага будаўніцтва Завадскога раёна.

Зазначыў, што Любатынскі з’яўляецца сябрам такой рэдкай партыі, як сацыяльна-спартыўная. Летась ён вылучаўся ў якасці кандыдата ад партыі на мясцовыя выбары па Аўтазаводскай выбарчай акрузе. Дэпутатам, праўда, стаў не ён, а намеснік дырэктара МАЗа Андрэй Заўгародні. Быў дэлегатам Усебеларускага сходу.

Спадар Любатынскі жанаты з яшчэ адной выпускніцай наргаса Святланай Захаранка (цяпер Любатынская), яна родам са Светлагорска. У пары ёсць дзеці: два сыны і малодшая дачка.

Ляснік у Заводскім раёне



Сяргей Масляк з сям'ёй. Фота з vk.com

Сяргей Масляк таксама з маладога пакалення менеджараў. Яму 38 гадоў. Родам ён з Мінска, з Чыжоўкі. Мама чыноўніка родам з Бабруйскага раёна.

Вучыцца Сяргей Масляк пайшоў у Тэхналагічны ўніверсітэт на спецыяльнасць «інжынер лясной гаспадаркі», які скончыў ў 2004 годзе. Па размеркаванню быў адпраўлены ў Валмянскае лясніцтва Мінскага раёна, дзе працаваў памочнікам ляснічага, адтуль сышоў інжынерам ў

«Белгіпралес». Узначальваў «Зеленгас» Завадскога раёна і Першамайскага раёнаў Мінска.

Апошнія чатыры гады быў старшынёй Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Масляк жанаты, мае дваіх дзяцей. На ягонай старонцы Укантакце змешчанае прыгожае сямейнае фота з адпачынку на Кіпры.

Кіраўнік Партызанскага раёна будаваў масты



Валерый Вараніцкі. Фота «Мінск-Навіны»

Партызанскі раён Мінска аддалі 40-гадоваму Валерыю Вараніцкаму. Выданне «Мінск-Навіны» піша, што Вараніцкі родам з Зэльвы, а сам скончыў БНТУ. Пачынаў сваю працоўную кар'еру ў «Мостбудзе» ў якасці старэйшага майстра. Быў галоўным інжынерам у «Гараўтамост».

Ад 2012 года працуе ў адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска. Ад 2015 года быў першым намеснікам кіраўніка раёна. Адзначым, што чыноўнік прымаў удзел у розных святкаваннях, які праходзілі на хіпстарскай Кастрычніцкай вуліцы ў Мінску.

Оцените статью 1 2 3 4 5 Средний балл 1.6 (24)

ЧИТАЙТЕ ЕЩЕ







Венедиктов: После мятежа Путин и Пригожин заключили договоренност…

Класкоўскі: Польшча і краіны Балтыі надалей будуць трымаць дамоклаў…

Чичваркин: «Лукашенко опирается исключительно на силовиков, никакого…



Последнее китайское предупреждение. На варшавской встрече…



Навумчык: «Ад палітычных дзеячоў залежыць шмат, але ня ўсё. У пэўныя…



Есть ли будущее у «Вагнера» без Пригожина?

ИЗБРАННОЕ



«У ягоных творах ёсьць тое, што робіць сухую гісторыю жывой, захапляльнай і…



Беларуска — о споре с сестрой из РФ: «Она сказала: царям никто не…



«Ваш режим несет ответственность за жизни этих людей»



Як Albae Russiae стала Беларуссю. Хто і калі даў назву нашай краіне



Поднявший кувалду...



«Россия. Август»

САЛІДАРНАСЦЬ

Независимые новости и комментарии о событиях в Беларуси. При использовании материалов "Салідарнасці" гиперссылка на сайт обязательна.

© "Салідарнасць", 2005-2023

gazetaby@gmail.com, reklama.gazetaby@gmail.com

Подпишитесь на вечернюю рассылку "Салідарнасці". Этот надежный канал, который позволяет читать наши новости и статьи даже в условиях блокировки сайта.

Email*

Ваша электронная почта

Подписаться

Предоставлено SendPulse